*Л. В. Паплаўная*
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# АСНОЎНЫЯ ПАМЫЛКІ І ІХ ПРАДУХІЛЕННЕ ПРЫ НАПІСАННІ ВОДГУКУ НА МАСТАЦКІ ТВОР

Рэспубліканская алімпіяда па беларускай мове і літаратуры, якая традыцыйна праводзіцца штогод у некалькі этапаў, дазваляе выявіць якасць падрыхтоўкі вучняў па вучэбных прадметах, іх кемлівасць і здольнасць дакладна і выразна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах. Моўныя спаборніцтвы актывізуюць і паглыбляюць працэс навучання роднай мове, абуджаюць цікавасць вучняў да заканамернасцей моўнай сістэмы, даюць магчымасць пераканацца ў багацці і непаўторнасці нашай мовы.

Рэспубліканская алімпіяда па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” праводзіцца ў тры этапы: напісанне водгуку на мастацкі твор; лінгвістычны конкурс; вуснае выказванне.

Напісанне водгуку на мастацкі твор належыць да найбольш складаных і адказных конкурсаў алімпіяды як для вучняў, так і настаўнікаў, якія займаюцца іх падрыхтоўкай. Гэта абумоўлена перш за ўсё творчым характарам конкурсу. Неабходна памятаць, што водгук з’уляецца не столькі формай праверкі пісьменнасці вучняў, колькі формай праверкі ўменняў і навыкаў аналізаваць мастацкі твор.

Мэта напісання водгуку – перадаць свае ўражанні аб мастацкім творы, расказаць пра пачуцці, якія выкліканы зместам твора, прапанаванага для водгуку. Аўтар водгуку павінен пазнаёміць са сваім успрыманнем твора, ужываючы аргументы, заснаваныя на асабістым чытацкім вопыце.

Як сведчыць вопыт працы з алімпіяднікамі, вучні валодаюць неабходнымі тэарэтычнымі ведамі і схемай напісання водгуку, пры гэтым на практыцы ўсё роўна дапускаюць памылкі, сярод якіх найбольш пашыранымі з’яўляюцца наступныя: няправільнае разуменне тэматыкі і праблематыкі твора; адсутнасць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вызначэння аўтарскай пазіцыі; абмежаванасць чытацкага вопыту; механічны пераказ тэксту; павярхоўнае асэнсаванне сюжэтных ліній твора; памылковая інтэрпрэтацыя вобразных сродкаў або іх схематычнае пералічэнне без указання функцыі ў тэксце; парушэнне кампазіцыі водгуку (уступ, асноўная частка, заключэнне). Як правіла, уступ можа быць зацягнутым або зусім адсутнічаць; часта назіраецца нелагічнасць пераходу ад уступу да галоўнай часткі; адсутнасць заключэння: шматлікія моўныя хібы (русізмы, недакладнае ўжыванне слоў, няправільна пабудаваныя сказы); фактычныя памылкі (называюцца сродкі, якіх няма ў тэксце; няправільна класіфікуюцца тропы і фігуры).

Трэба адзначыць і выкарыстанне ў работах вучняў завучаных для вуснага выказвання “загатовак”, якія штучна, не да месца ўводзяцца ў тэкст водгуку.

Для таго каб пазбегнуць гэтых тыповых памылак, трэба памятаць, што самае галоўнае ў напісанні водгуку – гэта ўменне прааналізаваць мастацкі твор. А для гэтага неабходна адказаць на тры пытанні:

Пра што гаворыцца ў тэксце (тэма, ідэя, праблемы).

*Тэма* – гэта кола грамадскіх з’яў і звязаных з імі жыццёвых пытанняў, якія аўтар кладзе ў аснову зместу твора і адлюстроўвае, раскрывае ў святле асноўнай ідэі.

*Ідэя* – асноўны сэнс мастацкага твора, які вынікае з ўсёй сістэмы вобразаў і карцін.

*Праблема* – гэта вострае жыццёвае пытанне, якое пісьменнік ставіць і па-свойму вырашае ў мастацкім творы.

Як, пры дапамозе якіх сродкаў і прыёмаў расказваецца пра падзеі. Неабходна прааналізаваць тропы і сінтаксічныя фігуры з улікам іх стылёвых функцый і ролі ў стварэнні індывідуальна-аўтарскага стылю.

З якой мэтай апавядаецца.

Не трэба баяцца выказваць уласныя меркаванні.

На нашу думку, праца над водгукам складаецца з двух асноўных этапаў.

Першы этап – гэта эмацыянальнае ўспрыманне твора. Ён патрабуе выканання наступных крокаў:

1. Першы раз чытаем тэкст, прапанаваны для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

водгуку, занатоўваем свае пачуцці і эмоцыі. Адказваем на пытанні: што мне спадабалася; што мяне здзівіла; з чым я не згодны?

2. Асэнсаванне асобы аўтара: успамінаем усё, што ведаем пра аўтара, яго творы, эпоху, да якой адносіцца яго творчасць.

3. Другі раз чытаем тэкст. Вызначаем тэму, ідэю, праблемы, аўтарскую пазіцыю.

4. Трэці раз чытаем твор. Вызначаем тып, стыль, жанравую прыналежнасць твора, разглядаем яго сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці. Вызначаем адметнасці тэксту на фанетычным, марфалагічным, лексічным, сінтаксічным узроўнях.

Другі этап працы – напісанне тэксту водгуку. Па магчымасці падбіраем эпіграф да водгуку. Але ён павінен абавязкова адпавядаць тэме.

Падчас аналізу твора неабходна строга прытрымлівацца структуры напісання водгуку: уступ, асноўная частка і заключэнне.

Уступ – гэта некалькі сказаў, мэта якіх “зачапіць” увагу, абудзіць цікавасць да напісанага. Уступ не павінен быць зацягнутым (1-2 абзацы), ён павінен быць звязаны з асноўнай ідэяй твора.

Асноўная частка – гэта дакладнае і вычарпальнае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора. У асноўнай частцы асабліва важна правільнае разуменне тэмы і праблемы твора, наяўнасць чытацкага вопыту (звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты з тэксту, уласныя паэтычныя радкі), дакладнае вызначэнне кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, вобразаў; вызначэнне адметнасцей тэксту на фанетычным, марфалагічным, лексічным, сінтаксічным узроўнях.

Пры аналізе лірычных твораў трэба звяртаць увагу на рыфму, вершаваны памер, якім напісаны твор.

Заключэнне павінна ўтрымліваць вывады з усяго сказанага: пра што хацеў сказаць нам аўтар, якія думкі і пачуцці ён хацеў данесці да чытача. Апошнія словы ў водгуку павінны быць яркімі, выразнымі і запамінальнымі.

На наш погляд, выказаныя парады дапамогуць лепш падрыхтавацца да такога складанага віду працы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

як напісанне водгуку на мастацкі твор. Але водгук – гэта від творчай працы, таму поспех на гэтым этапе спаборніцтва ў многім абумоўлены асабістымі здольнасцямі вучняў, іх уменнем разважаць, а не працаваць па шаблоне.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ